

Алесь Пісьмянкоў



БЕЛЫ КАМЕНЬ





АЛЕСЬ ПІСЬМЯНКОЎ
НАРАДЗІЎСЯ Ў 1957 ГОДЗЕ
Ў ВЁСЦЫ БЯЛЫНКАВІЧЫ
КАСЦЮКОВІЦКАГА РАЁНА
МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ.
Ў 1980 ГОДЗЕ СКОНЧЫЎ
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.
ПРАЦАВАЎ У КАСЦЮКОВІЦКАЙ
РАЁННАЙ ГАЗЕЦЕ
«СЦЯГ КАМУНІЗМУ»,
ШТОТЫДНЁВІКУ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА».
ЦЯПЕР РЭДАКТАР АДДЗЕЛА
НАВУКІ І МАСТАЦТВА
ЧАСОПІСА «ПОЛЫМЯ».
ВЕРШЫ ДРУКАВАЛІСЯ
Ў ЧАСОПІСАХ «ПОЛЫМЯ», «МАЛАДОСЦЬ»,
«БЕЛАРУСЬ»,
ІНШЫХ РЭСПУБЛІКАНСКІХ ВЫДАННЯХ.



ПЕРШАЯ КНІГА ПАЭТА

Алесь Пісьмянкоў

БЕЛЫ КАМЕНЬ

Вершы

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1983

Бел 2
П 35

Зборнік рэкамендаваны да друку
секцыяй паэзіі Саюза пісьменнікаў БССР

Рэцэнзент Уладзімір Марозаў

П $\frac{4702120200—141}{М 302(05)—83}$ 79—84 © Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1983.

БАЛАДА РОДУ

— Дзед, раскажы баладу роду,
Што ні кажы, ты — старажыл...

* * *

— З Дняпра наш продак родам,
З зямлі Машэкаў і Вашчыл.
Гарачы норавам і сэрцам,
Як люд у нашай старане,
Вачэй радзіміцкіх азерцы,
Крыху гарэзінкі на дне.
Любіў жыццё ён больш, чым бога,
Як мёд, піў вусны маладзіц.
Яго жыццёвыя дарогі
Працялі стрэлы навальніц.
Хоць плугам трызнілі далоні,
Ды не ржавеў ягоны меч,—
З ліхім іржаннем неслі коні
Яго праз вогнішча і смерць.
Калі ў крывавы час
напасцяў
Край бараніў ад груганоў,
Прымусіў многіх косці скласці...
Зірні, брат,
колькі курганоў!
З пяром і граматай у згодзе
Ён жыў. І незнарок,
Казалі, князь пры ўсім народзе
Яму імя даў — Пісьмянок.
Ён і пачаў баладу роду,

Вянец ён першы залажыў.
З Дняпра наш продак родам,
З зямлі Машэкаў і Вашчыл!
Курганы моўчкі спяць на ўлонні,
Даўно ў музеі лук і меч...
А мне ўсё сняцца тыя коні,
Што неслі продкаў цераз смерць.

РОДНАЕ

Над вёскай дымок гаркавы.
Размова касы з атавай.

У дом пад крылом буслiным
Жанчыны ідуць на радзіны.

Расчулены бацька надзіва —
Сын нарадзіўся. Радзіміч.

Маці трывожыцца: «Сыне...»
Вочы ў сына — сінія.

...Радзіны.
Радзіміч.
Радзіма.

ДА КАРЦІНЫ П. СЕРГІЕВІЧА «ЗВАНАР»

А звон заве ісці на «вы»,
Нібыта голас чалавечы.
Ён Беларусь заве на веча,
Каб адстаяць свае правы.

...Былым павеялі вякі,
І прыгадалася нанова:
Каб у народа вырваць мову,
Ў званоў ірвалі языкі.

ТРЫЗНЕННЕ ПАЎСТАНЦА

Надзіва ціха.
Схавай, аер...
Ты хто? Ласіха?
Ці, можа, смерць?

О, птах на вецці,
І ты не плач,
Скажы, дзе Вецер,
Як там Карпач?

О, край мой мілы,
Крывёю сцёк...
Як там Вашчыла?
Хаця б уцёк...

Мы на паганых
Пайшлі б з касой.

О, ранак, рану
Прамый расой!

Надзіва ціха.
Дзе я цяпер?
Ты хто? Ласіха?
Ці, можа... смерць?

КУШЛЯНСКАЯ БАЛАДА

Вось і мара яго расстраляна,
Ды вісельняў жах не спужаў.
Здаецца учора ў Кушлянах
Яшчэ конь Каліноўскага ржаў.

Здаецца учора ў Кушлянах...
Сумна мужыцкая скрыпка пяе,
Над крывавай палянай
Крывавае сонца ўстае.

Крывавіцца родная мова,
Яе дух несмяротны не знік.
І вы — не задушыце слова,
У слова не вырваць язык!

Ў дарогу сабраны пажыткі,
Аж заходзіцца плачам смычок.
Запяе на ўвесь свет па-мужыцку
І Мацей Бурачок.

...Гоніць холад турэмнага склепу,
Ды вісельняў жах не спужаў.
Яшчэ доўга ва ўкраінскім стэпе
Яму конь Каліноўскага ржаў...

МАЦІ

Пад галінак
весні грукат
да акна прыпала зноў.
Падалося —
гэта рукі
непабачаных сыноў,
ненароджаных унукаў...

СОН

І стала боязна да крыку,
І стала сорамна да слёз,
Нібы напомнілі пазыку,
Якой дасюль я не аднёс.
Нібы напомнілі пазыку,
Якой ужо не аддасі,
А над магіламі музыкаў
Самотна вецер галасіў.
І сэрца білася трывожна,
Палаў зарою небасхіл.
А я ўсё бег па бездарожжу
І кленчыў літасці ў магіл.

БЕЛАРУСЬ — БАГДАНОВІЧУ

Зямля! Дай моцы сыну,
Няхай ускрэсне ў ім
І з Полацка — Скарына,
І з Крошына — Багрым.

2 Зак. 3778

З УЛАДЗІМІРСКІХ УРАЖАННЯЎ

Хопіць бровы сумна хмурыць,
Медавухі лепш налі!
Ды давай махнём у Мурам
Да прапрадзеда Ільі.

Там, дзе руская адвага
Густа змешана з крывёй,
Сонца шапкай Манамаха
Узыходзіць над зямлёй.

І адкрыецца нанова,
Бытта ў княстве век жылі,
Ўсё — ад роспісу Рублёва
Да Пакрова-на-Нерлі.

* * *

У. Ламінскаму,
дырэктару Касцюковіцкага
краязнаўчага музея

Я слова кожнае лаўлю,
Крывёй ўзбухаюць даты.
Музей — для многіх экспанаты,
А Вы чытаеце зямлю.
Святое слова пра сыноў,
Пра іх, жывых і блізкіх,
І мы стаім ля курганоў,
І мы маўчым ля абеліскаў.

* * *

Калі ў вёсцы маёй
памiраюць дзяды,
У сэрцы маім
абрываюцца струны.
І дні, быццам чорныя труны,
Калі ў вёсцы маёй
паміраюць дзяды.
Тады замаўкаюць
птушыныя спевы,
І сонца на момант
згасае тады,
І падаюць долу
пакутныя дрэвы,
Калі ў вёсцы маёй
паміраюць дзяды.
Апошняга маршу
жалобныя гукі...
Не гэткія маршы
ім гралі гады!
...Рана-рана
сталеюць унукі,
Калі
паміраюць дзяды.

2*

У КАМЕНЦЫ

> У Каменцы — маёнтку Давыдавых — часта збіраліся дзекабрысты. Тут падоўгу жыў Пушкін.

Яшчэ не б'е Дантэсаў пісталет,
Не ганьбіць свецкая гамонка,
Яшчэ смяюцца звонка-звонка
Мішэль Бястужаў і Паэт.
Іх галасы нясе Цясмін *,
Нясе да быстрай рэчкі Росі,
Дзе барадаты селянін
Каторы дзень атаву косіць,
І ён пачуе гэты смех,
І ён на момант схамянецца:
— Хаця смяяцца гэтак грэх,
А ўсё-ткі хораша смяецца...
Слязу і пот змахне з павек
І ў бараду сабе ўсміхнецца:
— Глядзі, як хораша смяецца,
Харошы, пэўна, чалавек!
...Яшчэ не б'е Дантэсаў пісталет,
Не ганьбіць свецкая гамонка,
Яшчэ смяюцца звонка-звонка
Мішэль Бястужаў і Паэт.
Яны ідуць пад небам сінім —
Няхай іх сівер не кране,—
Яны гавораць пра Расію
І, можа, нават — пра мяне.

---

* Цясмін — рэчка, на беразе якой стаіць Каменка.

* * *

Вузельчыкі памяці,
Як маленькія курганы
З пахаваным болем...
Іх усё болей і болей
На тоненькай нітцы жыцця,
Як і маленькіх узгоркаў
На целе зялёнай зямлі...

БЕЛАРУСІ

Ці слова, ці песню крані —
Старажытнасць павее.
Не выстудзілі завеі
Упартыя карані.
Праз здрады і хіжасці град,
Праз войны і слёзы
Ты вынесла белыя косы
І чысты пагляд.

* * *

Жыццё, падзяліся сакрэтам,
Дай твае зразумець мне хады...
Стартуюць у неба ракеты,
Святлеюць пад сонцам сады.
Спазнаўшы і радасць, і мукі,
Зямлю ўратаваўшы з бяды,

Гасцююць на свеце дзяды —
На змену прыходзяць унукі.
Спяшаюцца вёсны з сяўбою,
Іх веры трапечацца сцяг.
Пагрозліва бразгае зброя
У суме па новых касцях.
А побач, дыханнем сагрэты,
Святлеюць пад сонцам сады...
Жыццё, падзяліся сакрэтам,
Дай твае зразумець мне хады.

ЗАПРАШЭННЕ

Цэлы год яе не бачыў,
Цэлы год яе не чуў.
Цэлы год як не рыбачыў
У зялёным лазняку.
Будзеш ты у нас не лішні,
Мо і сам ужо адчуў —
Будзем ў Вішнях есці вішні,
У Дуброве — алычу.
І пачнём чытаць шторання
Мы з табой дарог санет:
Каля Каніч слухаць каню
І журыцца ў Журбіне.
Добразычлівасць не згіне —
Ў нас гасціняцца сталы:
У Малінаўцы — маліны,
Ў Сакалоўцы — сакалы.
...Рэчка шэпчацца з аерам,
Дзень яшчэ не узышоў...
Мы на той паедзем бераг,
Дзе рыбачыў Куляшоў.

* * *

Там, дзе спеюць туманы,
За далёкай вярстой,
Ў садзе цёткі Ліксаны
Густа б'е лістабой.

Ў садзе цёткі Ліксаны
Вятры спаць прыляглі.
Яблык спелы, крамяны
Пачарнеў на зямлі.

Больш ніхто тут не вохкне,
Не збярэ навіну,
І заб'юць сёння вокны,
Як учора — труну!

Уздыхаюць суседзі,
Што крыху падпілі:
— Каб былі ў яе дзеці...
— Ах, каб дзеці былі!

— Ўсё чакала Усціна,
Ды чакала дарма...
— Дзетак бусел не скінуў
І ў капусце няма.

...Там, дзе спеюць туманы,
За далёкай вярстой,
Ў садзе цёткі Ліксаны
Густа б'е лістабой.

* * *

Брыду пад музыку мяцеліц,
Брыду ў нядаўняе «калі».
Дзе так здзіўляцца мы умелі,
Дзе так смяяцца мы маглі!

Я разумнею — разумею
Гадоў узрослую вагу.
І так здзіўляцца ўжо не ўмею,
І так смяяцца — не магу.

У ЗЕМЛЯКОЎ

...А тут усё проста
І ўсё чалавечна:
Радзіны і ксціны,
Сябрыны,
Як вечна.
Паліны й Куліны,
Сямёны й Мацеі
Без мараў
Пра вечнасць
Адвечнае сеюць.

* * *

Зашыпяць камяні чародай гусакоў,
Брат бярозавым венікам лясне...
Пасля доўгіх шляхоў,

Як у рай я ішоў,
У старэнькую бацькаву лазню.

Эх, парок! Ах, парок!
Сапраўды тут раёк.
Ой, даўно я не мыўся па дзелу!
— Яно й бачна, браток,
Ану — марш на палок! —
Твая скура зусім задубела...

О, бярозавы пах!
За узмахам узмах,
Сталі нават чырвонымі вёдры.
Шпарка венік сячэ,
Паддавай, брат, яшчэ!
І яшчэ... І яшчэ...
Ах, як добра!

* * *

Вечар вынырнуў нясмела,
Цені чорныя кладзе.
Сонца яблыкам паспелым
Хутка ў Бесядзь упадзе.

Вінны водар б'е у скроні,
Спелых яблык хмеліць пах.
Уздыхаюць сумна коні
На мядовых берагах.

У туманы клічуць сосны,
Нібы мачты караблёў.
Толькі мне збірацца позна —
Я ўжо сэрца раскалоў.

І, відаць, не выпадкова
Болю сціснулі ціскі:
Я не той, не свой, вясковы
І зусім не гарадскі.

* * *

Прыцішце, людзі, крышку крок,
Не зашуміце незнарок —
Спявае маці калыханку.

Гарыць, як зорка, давідна,
Уся — натхненне і вясна —
Спявае маці калыханку.

Ён сёння плакаў цэлы дзень,
Вялікі Пушкін ці Шапэн —
Спявае маці калыханку.

І дрэвы слухаюць усе,
І травы ў восеньскай расе —
Спявае маці калыханку.

Прыцішце ж, людзі, крышку крок,
Не зашуміце незнарок —
Спявае маці калыханку.

* * *

Не залоціць верасень
Больш дубам чубы.
У пажухлым верасе
Сны не сняць грыбы.

Позірк затуманіла
Роспачы імгла.
Плачам сэрца раніла
Жураvoў страла...

* * *

Я разумею, разумею,
І я душой збалеў па тым:
Цябе цаніць мы не умеем —
У горад птушкамі ляцім.
Далей ад бацькаўскага дома,
У кола дробненькіх патрэб...
А хлеб расце не ў гастраноме,
Не на асфальце спее хлеб!
З гнязда ўзляцім — і ходу, ходу
Шукаць у горад сваякоў.
К табе мы ездзім на прыроду,
Па сала ездзім да бацькоў.
А потым пішам і гаворым,
У любві клянёмся да зямлі...
А мне за рукі свае сорам —
Тваё баляць мне мазалі.

* * *

Грыбныя спорныя дажджы.
Уволю сонца і азону.
І мы з табой без парасона,
Як дзеці, радасна бяжым.
Няма ні зайздрасці, ні зла,
Няма ні кропелькі разліку.
Мы моцна любім свет вялікі,
Узлёт душы і ўзлёт крыла.

* * *

Сумуе без рыбы возера,
Алешнік дрыжыць — не засне:
Можа, пашча бульдозера
Заўтра яго праглыне.
А дзе ж ты, розум здаровы?
Чэзне прырода ў слязах.
Бачыш, як Бесядзь нервова
Б'ецца ў сваіх берагах.
А дзе ж ты, розум здаровы?
Без песень мярцвеюць гаі,
Грыбы ўцякаюць з дубровы,
Толькі ў паэтаў жывуць салаўі...

* * *

Брату Міколу

Тупаціць па вёсцы ранак,
Каля студняў і двароў.
Мусіць, зноўку нам на ганак
Ноч насыпала лістоў.

Ты глядзіш замілавана
На суседскія дубы,
Клічаш соннага Тумана:
«Пойдзем, рыжы, па грыбы!»

Напалам падзелім смачны,
Толькі спечаны пірог.
Ліжа ў нос Туман удзячна,
Так і трэцца каля ног.

Крочыш сцежкаю няспешна,
Летуценнік і дзівак...
Гэткі чысты і бязгрэшны,
Нібы светлы беразняк.

БАЛАДА ПРА ЛАСЯ

Зоркамі вышыты высі,
Нябёсаў малочны разліў.
Ледзьве да возера выйшаў
І піў усё,
піў!
І піў ён доўга,
сутаргова,

Тараніў крыкам далячынь.
Чырвоны снег гарэў
барвова,
Як нечы сорам уначы.
І зноўку стрэл!
Сачыўся ціха
Кавалак раненай зары...
І рэха
спуджанай ласіхай
Стагнала глуха
ў гушчары...

* * *

Вясёлае іржанне
І цоканне падкоў,
З вяселля на світанні
Вяртаемся дамоў.

Забыў перасцярогі
Наш конік вараны,
І сосны ля дарогі
Заснулі да вясны.

І моліць свацця бога,
Каб косці ёй збярог...
А нехта, бы ў бярлогу,
Ў сумёт з разгону лёг!

І снег — сняжок не мулкі...
О, сэрцаў перастук!
Азяблая снягурка
Гарачых прагне рук...

ПЕСНЯ

Ах, колькі слоў было гарачых!
Цябе, жаданую, сустрэў.
І ўсё наблытаў, перайначыў,
Сказаў не тое, што хацеў.
Хацеў сказаць, што набалела,
Хацеў сказаць, як я люблю...
Стаю, разгублены, няўмелы,
І твае пальцы цераблю.
А ты усмешкай асвяціла,
Усмешкай ранішняй зары.
Дарэмна ночка запаліла
Сягоння ў небе ліхтары.
А ў сэрцы, ў сэрцы непаладкі,
Якіх ніколі не было...
А ты стаіш — уся загадка,
Уся і казка, і святло.
...Ах, колькі слоў было гарачых!
Цябе, жаданую, сустрэў
І ўсё наблытаў, перайначыў,
Сказаў не тое, што хацеў.

ЛІСТ ДА БРАТА

Пацішэла ў нашай хаце,
Там нярэдка плача маці,
Пра цябе згадаўшы сны.

Бацька ходзіць задуменны,
Вочы свецяцца праменна:
«Вось і выраслі сыны!»

Дзесь калодзеж ціха рыпнуў,
Кукарэкнуў певень хрыпла,
Даючы пашану дню.

І Туман з вясёлым брэхам
Не мяце хвастом па снезе,
А вартуе цішыню...

* * *

Бывайце, сумныя цытаты,
Бывай, навукі тлумны том!
Я чую водар свежай мяты,
Змяшанай з цёплым малаком.
Я чую поціск рук шурпатых,
З якіх не сходзяць мазалі,
Сыноў параненых салдатаў,
Што павярнулі лёс зямлі.
Талкуюць хлопцы каля хаты,
Дамоў прыехаўшы здалёк,
Што ў нас павыраслі дзяўчаты
І што дзяўчаты — самы сок!
Усмешкі радасна гарэзяць,
Душой не вучаны крывіць,
Я кожным нервам чую Бесядзь
У кожнай кропельцы крыві!

* * *

Пагодліва й марозна
У роднай старане.
Заснежаныя сосны
І музыка саней.

Не трэба слоў, не трэба!
На момант анямей.
Замры, як птах у небе,
Пад музыку саней.

Ўяві сябе малога,
Са светам парадней...
Зімовая дарога
І музыка саней!

РОЗДУМ

Мусіць, гэта страшна —
заблудзіцца на незнаёмай
вуліцы
чужой душы?..
Намнога страшней,
чым на тлумнай вуліцы
чужога горада,
дзе можна
звярнуцца ў бюро даведак
і ўзяць дакладны адрас.
Але дзе ўзяць адрас
чужой бяды,
чужога гора,

чужой радасці?
Як заўсёды,
пачнецца таптанне на месцы,
сляпое бадзянне туды-сюды,
пакуль не наступіш
на самае... балючае.

* * *

Крэўную сувязь
са светам адчуй,
Палюбі
мураша і былінку!
Ля крынічкі
пастой хоць хвілінку
І ў мурожнай капе
заначуй.
Перапёлку
паслухай ў жытах,
І вецер
паслухай у соснах.
Ты і сам —
устрывожаны птах,
Што пад небам
трапеча высозным.
Трывогу і радасць
яго падзялі,
Бо і ты
непакрыўджаны лёсам
Пад купалам зорным
нябёсаў,
Сагрэты
дыханнем зямлі.

* * *

І калі б са мною быў
транзістар,
Я яго б мядзведзю падарыў.

А. Пысін

Гудзе замежная эстрада,
Сасоннік корчыцца стары,
А мне так хочацца дахаты
У камарыныя бары.
А дзе сябрына траў і сонца
Вартуе неруш спарыша,
Дзе п'е мядзведзь і сёння сонны
Азон, чысцейшы за пяршак.
А дзе арэх вавёрка лушчыць
І Бесядзь венаю дрыжыць.
Я буду смачна сёрбаць юшку,
Якой не еў і старажыл.
Той простай радасцю багаты,
Што язь звычайны падарыў...
Гудзе замежная эстрада —
Сасоннік корчыцца стары.

* * *

Я veni,
vidi,
vici!
Адкінь дарэмны страх.
Забіся, як сініца,
У радасных руках.

Ад шчасця анямею —
Пустых не трэба слоў.
Ахмелены, шалею
Ў саломе валасоў.
Сыдуцца вуснаў соты,
Сыдуцца ў соты раз.
Аддам табе пяшчоты
Нястрачаны запас.
Мільгнула ты сініцай,
Рукі ягоны ўзмах...
I veni,
      vidi,
            vici
Рассыпалася ў прах...

* * *

Аднакласнікам

Гары, касцёр, гары!
Нібы маяк святога брацтва,
Нарэшце мы змаглі сабрацца.
Гары, касцёр, гары.

Ты нашу памяць падагрэй
I завядзі у тое лета,
Калі мы ўсе былі па[illegible]ы,
Калі наіўней і дабрэй.

. . . .

Гары, касцёр, гары...

* * *

Адплакаў верасень за плотам,
Разрэзаў неба белы клін.
Асенні сад, прапахлы мёдам,
Згарэў у полымі рабін.
Няма, няма чароўных пахаў,
Вятры заплакалі званчэй.
І б'юць не яблыкі па даху —
Лістота восеньскіх начэй.
Трывожаць новыя турботы,
Як сум асенніх журавін...
Зноў сніцца сад, прапахлы мёдам,
У яркім полымі рабін.

* * *

Слова маё,
можа, жыць табе дзень,
ўсяго дзень толькі
жыць...
Памажы ж
чалавеку ў бядзе,
ў роспачы
памажы!
Слова маё.

* * *

Мы молімся крынічаньцы,
Ды ў тым няма граху:
Мы ўсе крыху язычнікі,
Паэты ўсе крыху.
І ты,
        банальнасцю атручаны,
Чаму, скажы, сачыў
Агонь,
        даўно прыручаны,
Бы толькі прыручыў.
Турботы ўсе адхінуўшы,
Над рэчкай, ля куста,
Слядоў птушыных клінапіс
Чытаеш па складах.
І ўчора шчэ стрыножаны,
Лянівы,
        быццам лінь,
Глядзіш чаму ўстрывожана
ў святую далячынь?!

* * *

Прастуджана ўскрыкнуў цягнік,
вінавата і квола,
нібы папрасіў прабачэння,
што нікога сюды не прывёз.
Дзяжурны ўздыхнуў невясёла
і доўга курыў ля бяроз,
а месяц у небе халодным
вісеў,
        як пытальнік...

МАЛЮНАК

Прыстань
І замры на імгненне,
Калі ты душой не аглух:
Скалелы алешнік,
Як статак аленяў,
Прылёг на заснежаны луг.
Прыселі
Азяблыя птушкі
На крохкі сярэбраны рог —
Звычайны пейзаж беларускі
Ля самых звычайных дарог.

* * *

Імгненне — год,
Гадзіна — век.
Дрыжыць сляза
Ў турме павек.
Там боль і ноч.
Там ноч і боль.
Забыт пароль —
Дзвюх рук пароль.
І рукі — з плеч,
Як лёсу меч,
У плечы: «Прэч!»
Як лёсу меч,
Што нас рассек...
Імгненне — год,
Гадзіна — век.

НОЧ НА ВОЗЕРЫ

...Не заснуць нам да раніцы.
Тут, на беразе раю,
Больш душа не параніцца
Аб тваё «не кахаю».

Хвалі і бераг раюцца,
Вогнішча дагарае...

* * *

...А цяжар налёг калодай,
Прыдавіўшы сэрца крык...
Твой цягнік за паваротам
Назаўсёды, можа, знік.
Можа, знік ён назаўсёды,
Я нікога не віню:
Сам хацеў я з асалодай
Загарэцца ад агню.
Мне ісці-брысці ў туманы,
Мне ўначы кастром гарэць.
Ўспамінаць усхвалявана
Слоў раскіданую медзь.
І вачэй мядовых соты,
Цягніка трывожны крык,
Што цяпер за паваротам
Назаўсёды, можа, знік...

У АДСТАЎЦЫ

— Хоць сам скубі мураўку —
Застаўся, брат, адзін!
Мы з конюхам ў адстаўцы,
Ідзём у магазін.

— Гнядых мінула царства,
Нясплочаны даўгі...
Памёр, каб не лякарства —
Лякарства ад тугі.

І слёзы, як гарошыны,
І слёзы без маны...
— Хаджу на луг пакошаны,
Дзе пасвіў табуны.

Хаджу, як заваражаны,
І некуды ўцячы,
Нібы душу стрыножылі —
То плачыць, то крычыць...

* * *

Чаму так трывожна,
Так цесна-цесна
І так горача-горача?
Я ж так хацеў,
Каб перастаў біцца
Пульс нашых сустрэч.
Каб хутчэй развязаўся вузельчык,
Што звязваў нас разам.

Каб хутчэй датлеў той
агеньчык,
Што грэў нас абоіх,
Каб дым нашых мрояў
І попел адчаю
Вецер развеяў...

* * *

Ішлі тралейбусы няспешна
У сваёй рагатай чарадзе.
Адной жанчыне стала смешна:
— Глядзіце, п'яніца ідзе!
— Змагар...
— Змагаўся з пляшкай...
Як грозны выбух, грымнуў смех.
Ён крок зрабіў і рухнуў цяжка,
Асеў на лавачку, як мех.
Машыны беглі безупынку
У святле неонавых вітрын.
Натоўп стракаты на прыпынку
Растаў, нібыта стэарын.
І дзядзька хворы адзінока
На рукі звесіў галаву...
А светафор чырвоным вокам
Мільгаў няведама каму.

* * *

Быццам мараў воблікі,
Праплываюць воблакі.
Недзе там у Боблаве
Даспяваюць яблыкі.
Там дачкою Евінай —
Падысці няёмка —
Між старымі дрэвамі
Ходзіць Незнаёмка.
І ля самых воблакаў
Кружыць слова Блокава!
...Зараз там у Боблаве
Даспяваюць яблыкі.

* * *

Заявіўся і знік,
Дома скінуўшы стому.
А жыццё, як цягнік,
Што вязе ў невядомасць.

Адчуванне віны
Глушыць шчасце ўспамінаў:
У бацькі — больш сівізны,
У маці — маршчынак...

* * *

«Без мяне ўжо атаву дакосяць —
Клічуць продкі на вечны спачын...»
З галавою цвярозай, як восень,
Ён спакойна глядзіць ўдалячынь.
Бы мудрая Ева, унучка малая
Бурштынавы яблык грызе.
...З дрэва дрыготкі лісток ападае,
Свой сум над зямлёю нясе...

У КАРАЛІШЧАВІЧАХ

Неба — зорная ваза,
Хоць вачэй не адводзь.
А мы хочам Пегаса
Забрытаць у аброць.
Колькі спрэчак адразу!
Думкі рэжуць ілбы:
Як адрозніць Пегаса
Ад звычайных кабыл...

* * *

...А думкі роем,
Куды ні збоч...
І толькі мроі
Мне дорыць ноч.

Успаміны цешаць,
Бягуць гады.
На белым снезе
Твае сляды...

Ну хто залечыць
Тугу і боль?
...Заплакаў вецер
Аб нас з табой.

* * *

...Можа, сапраўды
гэта смешна
і пахне дзівацтвам —
зоркі лавіць уначы,
апякаючы сэрца і пальцы,
а раніцай здзіўлена бачыць,
што гэта зусім і не зоркі,
а — камяні.

* * *

Шукаць дарэмна спарыша,
Каўтні слязы салёнасць:
Паміж злыселых клёнаў
Гарыць твая душа,
Гарыць агнём зялёным.

* * *

Я прачытаў твае сляды
Тут, на прыцішанай алеі,
Адзін у золаце завеі
Я прачытаў твае сляды.
І ціхі вецер, як скрыпач,
Іграў на голлейках асіны.
І клін тужлівы жураўліны
Нёс над зямлёй апошні плач.
І я не каяўся ні ў чым,
І я не кляў цябе за мукі.
Зноў ажылі былыя гукі,
Яны зліваліся у гімн,
Каб загучаць, як і тады,
Тут, на прыцішанай алеі,
Дзе зноў у золаце завеі
Я прачытаў твае сляды.

ТРЫЯЛЕТ

Паміж намі маўчанне і холад.
Паміж намі зіма і зіма.
Ты даўно зразумела сама —
Паміж намі маўчанне і холад.
Хай вясна урываецца ў горад.
Я ільдзіны не стану ламаць...
Паміж намі маўчанне і холад,
Паміж намі зіма і зіма.

* * *

Змоўклых паркаў кастры
Дагараюць на вуліцы...
Не журы,
                    не журы —
Нашы душы прытуляцца
І бяда перамелецца!
Ты святло не гасі...
Залатая мяцеліца
Над кафэ...
                    Над таксі...

* * *

О, як мне доўга трэба жыць,
Калі аддаць табе адплату
За ўсе густыя снегапады,
За ўсе духмяныя дажджы.
За рэчак быстрых сіняву
І за дуброў зялёных веча.
За кожны дзень, за кожны вечар,
За тое шчасце, што жыву.

Мая маленькая зямля! —
Ўся ў палыне і медуніцы.
З тваіх крыніц мне не напіцца,
Хоць буду піць і спакваля.
Жыві ж, жыві!
                    Плыві між зор!
І чуюць хай на ўсіх планетах,
Як пахнуць кветкі і ранеты
У нашых вёсках ля азёр.

* * *

Прылегчы ў пахкую траву,
Глядзець спакойна у нябёсы.
Глядзець, як воблакі над лёсам
Плывуць...
Адчуць сябе травінкай
сярод траў,
Ці ліўнем вымытай лістотай,
Ці жаўруком перад палётам,
Што неба крыллем не кранаў.

22 ЧЭРВЕНЯ 1981 Г.

...Цяжэюць у садзе плады.
У кронах высокіх — высокія песні.
Сталее наш сад малады,
Сад — мой равеснік.

Сягоння, пагодлівым днём,
Мы вельмі падобныя ў нечым:
Гэткая ж вера ў моц каранёў
І надзея, што час не скалечыць...

ПРЫЗНАННЕ

Не трызніць душа
гаражамі.
Дзіўна,
што ў горадзе вёскай жыву.

Страшна,
што сын-гараджанін
Босы байца
ступіць на траву.

СЯБРУ

Хай душа баліць,
Прагані прэч страх.
Вецер-цымбаліст
Грае на лістах.
Будзе ноч без зор,
Будзе ноч без сна.
Раскладзём касцёр
І нальём віна.
І памянем тых,
Што любілі нас.
І даруем тым,
Што забылі нас.
Як і мы калісь,
Ды не ў гэтым соль...
Хай душа баліць,
Хай ачысціць боль.

* * *

Як гэта хораша —
юнацтва!
У юнацтве
сонечныя дні,

Ў юнацтве —
толькі брацтва,
Святло надзей
і чысціні.
Усплёскі хваль.
Ружовы ветразь.
Ружовы свет.
Ружовы сад.
Яшчэ ні кропелькі няверʼя,
Яшчэ ні ў чым ні вінават.
Разлік пачуццяў
не халодзіць,
Усходзіць
ранак залаты...
Юнацтва — мёд,
і ў гэтым мёдзе
Яшчэ не чутна
гаркаты.

* * *

Ты адбі мне тэлеграму,
Што у нашай старане
Ў ціхай вёсцы Белы Камень
Выпаў белы-белы снег.
Вёсак многа. Ёсць другія.
Ў вёсках нашы карані.
У мяне не настальгія —
Проста сум па чысціні.
Проста сум па белым полі,
Па рабінавым агні,

Проста хочацца да болю
Першароднай чысціні,
Незапэцканай рукамі,
Што з душы здымае грэх...
Проста ў вёсцы Белы Камень
Самы белы ў свеце снег.

* * *

Жытла ў нас не было —
Ні даху і ні страху.
У нас жыло святло,
Была крылатасць птахаў.

Быў позні лістапад
З адвечнай варажбою.
І я назваў цябе
Сястрою,
І ты пазвала ціха:
«Брат...»

У нас былі свае дажджы
І зорнасць парасонаў.
Дажджы вучылі жыць
Па іх законах.

Жытла ў нас не было,
Святло было і свежасць.
Падумаеш — жытло,
Калі нам свет належаў!

* * *

Вада, крынічная вада.
Відаць, пілі такую продкі.
Вось гэтак прагна і салодка —
Аж забывалася бяда.
І коней кінуўшы на ўзмежку,
Яны лажыліся ў траву.
Пілі з даверлівай усмешкай
Нябёс густую сіняву.
Гулі натруджаныя рукі,
І думкі-воблакі плылі.
А можа, мроіліся ўнукі,
Што іх паўтораць на зямлі.
І, ліхадзеям на здзіўленне,
Ўратуюць мовы спеўны лад.
І іх крынічнае сумленне,
І іх падсінены пагляд.

ПАЭТ

Ён ранкам падкову
знайшоў у расе,
шчаслівчык,
адораны лёсам,
і кожны падумаў:
дамоў панясе!
А ён — шпурлянуў у нябёсы:
«Будзем, людзі, шчаслівыя ўсе!»

ЗМЕСТ

Балада роду 5
Роднае 6
Ля карціны П. Сергіевіча «Званар» 7
Трызненне паўстанца 7
Кушлянская балада 8
Маці 9
Сон 9
Беларусь — Багдановічу 9
З уладзімірскіх уражанняў 10
*** Я слова кожнае лаўлю.. 10
*** Калі ў вёсцы маёй... 11
У Каменцы 12
*** Вузельчыкі памяці... 13
Беларусі 13
*** Жыццё, падзяліся сакрэтам... 13
Запрашэнне 14
*** Там, дзе спеюць туманы... 15
*** Брыду пад музыку мяцеліц... 16
У землякоў 16
*** Зашыпяць камяні... 16
*** Вечар вынырнуў нясмела... 17
*** Прыцішце, людзі, крышку крок... 18
*** Не залоціць верасень... 19

*** Я разумею, разумею... 19
*** Грыбныя спорныя дажджы... 20
*** Сумуе без рыбы возера... 20
*** Тупаціць па вёсцы ранак... 21
Балада пра лася 21
*** Вясёлае іржанне... 22
Песня 23
Ліст да брата 23
*** Бывайце, сумныя цытаты... 24
*** Пагодліва й марозна... 25
Роздум 25
*** Крэўную сувязь са светам адчуй... 26
*** Гудзе замежная эстрада... 27
*** Я veni, vidi, vici... 27
*** Гары, касцёр, гары!.. 28
*** Адплакаў верасень за плотам... 29
*** Слова маё... 29
*** Мы молімся крынічаньцы... 30
*** Прастуджана ўскрыкнуў цягнік... 30
Малюнак 31
*** Імгненне — год... 31
Ноч на возеры 32
*** ...А цяжар налёг калодай... 32
У адстаўцы 33
*** Чаму так трывожна... 33
*** Ішлі тралейбусы няспешна... 34
*** Быццам мараў воблікі... 35
*** Заявіўся і знік... 35
*** Без мяне ўжо атаву дакосяць... 36
У Каралішчавічах 36

*** ....А думкі роем... 36
*** ...Можа, сапраўды... 37
*** Шукаць дарэмна спарыша... 37
*** Я прачытаў твае сляды... 38
Трыялет 38
*** Змоўклых паркаў кастры... 39
*** О, як мне доўга трэба жыць... 39
*** Прылегчы ў пахкую траву... 40
22 чэрвеня 1981 г. 40
Прызнанне 40
Сябру 41
*** Як гэта хораша... 41
*** Ты адбі мне тэлеграму... 42
*** Жытла ў нас не было... 43
*** Вада, крынічная вада... 44
Паэт 44

Пісьмянкоў А.

П 35 Белы камень: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1983.— 47 с., іл.— (Першая кніга паэта).

15 к.

У кнігу ўвайшлі вершы, у якіх апяваецца вернасць Радзіме, хараство роднай прыроды, чысціня кахання.

Для творчай манеры А. Пісьмянкова характэрныя прачулы лірызм, непасрэднасць і шчырасць паэтычнай інтанацыі.

П $\frac{4702120200-141}{М 302(05)-83}$—79-84

ББК 84Бел7
Бел2

Первая книга поэта

Александр Владимирович Письменков

БЕЛЫЙ КАМЕНЬ

Стихи

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Л. В. Дранько-Майсюк. Мастак Н. У. Шаўшукова. Мастацкі рэдактар А. М. Малышава. Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч. Карэктар Л. П. Бялова.

ІБ № 2044
Здадзена ў набор 13.06.83. Падп. да друку 06.09.83. АТ 08709. Фармат 70×90 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 1,75. Ум. фарб.-адб. 3,29. Ул.-выд. арк. 1,64. Тыраж 3000 экз. Зак. 3778. Цана 15 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.